## PERFECTUM CONJUNCTIVI PASSIVI

Perfectum conjunctīvi passīvi (прошлы час закончанага трывання ўмоўнага ладу залежнага стану) складаецца з двух слоў і ўтвараецца спалучэннем participium perfecti passīvi з дзеясловам sum, fui, —, esse — *быць* у praesens conjunctīvi:

| | | |
|---|---|---|
| **Participium perfecti passīvi** | **і** | **sum, fui, —, esse у praesens conjunctīvi** |

**Узор спражэння**
**laudo, āvi, ātum, 1 (аснова supīnum: laudāt-);**
**scribo, psi, ptum, 3 (аснова supīnum: script-)**

| Асоба | laudo, 1 — *хваліць* | | scribo, 3 — *пісаць* | |
|---|---|---|---|---|
| | Singulāris | | | |
| 1-я | laudāt-**us**, **a**, **um** | **sim** | script-**us**, **a**, **um** | **sim** |
| 2-я | laudāt-**us**, **a**, **um** | **sis** | script-**us**, **a**, **um** | **sis** |
| 3-я | laudāt-**us**, **a**, **um** | **sit** | script-**us**, **a**, **um** | **sit** |
| | Plurālis | | | |
| 1-я | laudāt-**i**, **ae**, **a** | **simus** | script-**i**, **ae**, **a** | **simus** |
| 2-я | laudāt-**i**, **ae**, **a** | **sitis** | script-**i**, **ae**, **a** | **sitis** |
| 3-я | laudāt-**i**, **ae**, **a** | **sint** | script-**i**, **ae**, **a** | **sint** |

## PLUSQUAMPERFECTUM CONJUNCTIVI PASSIVI

Plusquamperfectum conjunctīvi passīvi (запрошлы час умоўнага стану залежнага стану) складаецца з двух слоў і ўтвараецца спалучэннем participium perfecti passīvi з дзеясловам sum, fui, —, esse — *быць* у imperfectum conjunctīvi:

| | | |
|---|---|---|
| **Participium perfecti passīvi** | **і** | **sum, fui, —, esse у imperfectum conjunctīvi** |

**Узор спражэння**
**laudo, āvi, ātum, 1 (аснова supīnum: laudāt-);**
**scribo, psi, ptum, 3 (аснова supīnum: script-)**

| Асоба | laudo, 1 — *хваліць* | | scribo, 3 — *пісаць* | |
|---|---|---|---|---|
| | Singulāris | | | |
| 1-я | laudāt-**us**, **a**, **um** | **essem** | script-**us**, **a**, **um** | **essem** |
| 2-я | laudāt-**us**, **a**, **um** | **esses** | script-**us**, **a**, **um** | **esses** |
| 3-я | laudāt-**us**, **a**, **um** | **esset** | script-**us**, **a**, **um** | **esset** |
| | Plurālis | | | |
| 1-я | laudāt-**i**, **ae**, **a** | **essēmus** | script-**i**, **ae**, **a** | **essēmus** |
| 2-я | laudāt-**i**, **ae**, **a** | **essētis** | script-**i**, **ae**, **a** | **essētis** |
| 3-я | laudāt-**i**, **ae**, **a** | **essent** | script-**i**, **ae**, **a** | **essent** |

## Conjugatio periphrastica activa

Conjugatio periphrastĭca actīva (апісальнае спражэнне незалежнага стану) складаецца з двух слоў і ўтвараецца спалучэннем participium futūri actīvi з дзеясловам sum, fui, —, esse — *быць* у любой асабовай форме. Мае значэнне намеру, жадання, падрыхтаванасці і да т. п. Час, лад, асоба і лік усёй формы адпавядаюць формам дзеяслова sum.

**Прыклады форм.**
**scribo, psi, ptum, 3 (аснова supīnum: script-)**

| | | |
|---|---|---|
| scriptūrus, a, um sum | *praes. ind. act.* 1 *sg.* | *я маю намер пісаць* |
| scriptūrus, a, um eras | *imperf. ind. act.* 2 *sg.* | *ты меў намер пісаць* |
| scriptūrus, a, um erit | *fut. I ind. act.* 3 *sg.* | *ён будзе мець намер пісаць* і г. д. |

Формы conjugatio periphrastĭca actīva ужываюцца ў некаторых тыпах даданых сказаў, прычым, не маючы значэння намеру, указваюць толькі на будучае дзеянне; пры гэтым praesens conjunctīvi ужываецца пасля галоўных часоў (формы на -ūrus sim), imperfectum conjunctīvi – пасля гістарычных часоў (формы на -ūrus essem):

| | |
|---|---|
| scriptūrus, a, um sim | *praes. conj. act.* 1 *sg.* |
| scriptūrus, a, um essem | *imperf. conj. act.* 1 *sg.* |

## Ускоснае пытанне

Ускоснае пытанне (quaestio oblīqua) — гэта даданы дапаўняльны сказ, які залежыць ад дзеясловаў і выразаў са значэннямі *пытацца*, *казаць*, *бачыць*, *чуць*, *ведаць* і г. д.

Далучаецца:

а) пытальнымі часціцамі (-ne — *ці?* num — *няўжо*, *хіба?* nonne — *няўжо не*, *хіба не?* an — *ці*, *няўжо?* utrum … an — *ці … ці?* si — *ці?*);

б) пытальнымі займеннікамі (quis — *хто?* quid — *што?* qui, quae, quod — *які?* qualis, e — *які?*);

в) пытальнымі прыслоўямі (ubi — *дзе?* unde — *адкуль?* quare, cur — *чаму?* quo — *куды*, *дзе?* quot — *колькі?* quando — *калі?* quam — *як?* (перад прыметнікамі і прыслоўямі)/quomŏdo — *як?* (перад дзеясловамі) і г. д.

Ва ўскосным пытанні ўжываюцца наступныя формы кан'юнктыву:

| Час у галоўным сказе | Дзеянне даданага сказа адносна дзеяння галоўнага сказа | | |
|---|---|---|---|
| | аднachасовае | папярэдняе | будучае |
| Галоўны | *praes. conj.* | *perf. conj.* | *conj. periphr. act.* у *praes. conj.* (форма на -ūrus sim) |
| Гістарычны | *imperf. conj.* | *pqperf. conj.* | *conj. periphr. act.* у *imperf. conj.* (форма на -ūrus essem) |

Напрыклад: Quaero, veniasne ad me. — *Я пытаюся, ці ідзеш ты да мяне.* Quaero, utrum ventūrus sis ad me an non. — *Я пытаюся, ці прыйдзеш ты да мяне ці не*. Quaesīvi, quis ventūrus esset ad me. — *Я спытаўся, хто прыйдзе да мяне*. Quaesīvi, cur venisses ad me. — *Я спытаўся, чаму ты прыйшоў да мяне.*